Зацвярджаю
Начальнік аддзела адукацыі,
спорту і турызму
І.В. Асташэвіч
“ “ кастрычніка 2017 г.

.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2017/2018 навучальны год**
**Комплексная работа**

**10 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Размяркуйце словы на чатыры групы і запішыце ў табліцу.**

Адказ, перабежчык, на дарожцы, носішся, цвёрды, сцежка, счарсцвець, звечарэла, езджу, адвесці, айсберг, сшыць, носьбіт, у печцы.

| Асіміляцыя па глухасці і звонкасці | Асіміляцыя па мяккасці | Асіміляцыя свісцячых да шыпячых | Асіміляцыя шыпячых да свісцячых |
|---|---|---|---|
| | | | |

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

**Заданне 2. Раскрыйце дужкі, аднавіце фразеалагізмы і растлумачце значэнне гэтых ўстойлівых выразаў. Запішыце.**

Браць, пабраць, ухапіць (крошачкі, горлам, шылам кашы).

_______________________________________________
_______________________________________________
_______________________________________________
_______________________________________________

*Максімальная колькасць балаў –3.*

**Заданне 3. Праз сінонімы або апісальна патлумачце значэнне наступных слоў.**

Дойлід - __________________; кашнэ - __________________; атрамант - ________________; батлейка - ________________________; вершнік - ____________________; зёлкі - _______________________; інсургент - _____________________; кампраміс - _______________________.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 4. Запішыце па-беларуску наступныя назвы населеных пунктаў.**

Ганцевичи, Марьина Горка, Телеханы, Чечерск, Заславль, Верхнедвинск, Красносельский, Бегомль.

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 5. З улікам асаблівасці словаўтварэння ў кожным радзе знайдзіце чацвёртае “лішняе”. Абгрунтуйце свой выбар.**

1) Драбніца, кісліца, сальніца, цяпліца -

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________.

2) Падгалосак, падзагаловак, падлесак, падпасак -

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________.

3) Громаадвод, законапраект, лесастэп, торфабрыкет-

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________.

4) Аб’ездзіць, абкасіць, абмакнуць, абмежаваць -

_____________________________________________________________________

_____________________________________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 6. Аднавіце сказы, пераклаўшы словазлучэнні на беларускую мову.**

1) Волеччын твар быў цяпер так падобен да твару зусім малой дзяўчынкі, якая (подражает поступкам) сваёй маці!

_____________________________________________________________________

_________________________________________________________________

2) Яна спынілася (шагах в двадцати) і пазірала на брата з-пад рукі.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

3) Але іх жа вунь колькі (ухаживало за Аннушкой), а яна - ні прыступу.

____________________________________________________________

____________________________________________________________

4) Васіль ужо не раз (про себя) адзначаў, што яна прыбіраецца, ідучы на спатканне, і гэта яго поўніла гонарам.

____________________________________________________________

____________________________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 7. Пастаўце, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Запішыце, чым ускладнены кожны сказ.**

1) Малы хлапчук унучак дзедаў сядзеў на возе.

____________________________________________________________

____________________________________________________________.

2) Лёд бы камень самацветны блішчыць праменнаю ігрой.________________________________________________

____________________________________________________________.

3) Здаецца увесь поплаў звініць спявае.____________________________________________

____________________________________________________________

4) Людзі а іх было багата проста за жываты хапаліся ад смеху.________________________________________________

____________________________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Заданне 8. Запішыце імёны і прозвішчы пісьменнікаў, якім належаць псеўданімы**.

1)Янка Лучына - ______________________________________;

2) Янка Купала - ______________________________________;

3) Алесь Гарун - ______________________________________;

4) Якуб Колас - ______________________________________;

5) Мацей Бурачок - ___________________________________ ;

6) Цётка - __________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў –3.*

**Заданне 9. Адзначце у радзе лішняе слова. Абгрунтуйце чаму.**
Эпас, лірыка, драма, санет.

___________________________________________________________________________

___________________________________________________________________________.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

**Заданне 10. З якога твора наступныя радкі . Назавіце твор і аўтара.**

Як адгалосак, як цень свайго мужа, яна жыла яго жыццём.. Ён быў як бы сонцам, а яна планетай, якая кружылася вакол сонца. І ён лічыў жонку адзінай разумніцай на свеце, спадзяваўся, што надыдзе час - ён па-сапраўднаму праславіцца далёка ў людзях.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*